залежнасці ад індывідуальных праяў функцыянальнай асіметрыі іх мозгу, што павінна стымуляваць складанне дыферэнцыраваных праграм навучання і карэкцыйнай працы, дапамагчы адказаць на пытанне, каго і як вучыць.

Пры далейшай распрацоўцы атрыманыя даныя маглі б знайсці выкарыстанне пры адборы ў спецыялізаваныя навучальныя ўстановы.

**Гарустовіч Н.В.,**
аспірантка кафедры
менеджменту сацыякультурнай дзейнасці

## МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ПРАДЗЮСЕРСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Прадзюсерская дзейнасць у канцы XX ст. набыла даволі значную ролю ў суадносінах паміж мастаком у шырокім сэнсе гэтага слова і грамадствам. У грамадства, безумоўна, існуе патрэба ў эстэтычным, мастацкім асваенні свету, дакладней, у творах мастацтва і іншых прадуктах культуры. Прадзюсер адказны перад грамадствам у першую чаргу як перад спажыўцом. Гэты працэс утварае сістэму, элементы якой звязаны паміж сабой:

1) творы мастацтва (мастацтва, немастацтва, псеўдамастацтва, масавае і элітарнае мастацтва);

2) дзяржава, рынак, прадзюсер — элемент сістэмы (рэгуляванне стварэння і пераходу прадуктаў культуры да спажыўца);

3) спажывец — грамадства: эліта і “маса”.

Сістэма ўмоўная і не з’яўляецца дагматычнай мадэллю стварэння і спажывання грамадствам твораў мастацтва. Часта дыялог людзей з мастацтвам адбываецца без пасрэднікаў. Аднак у большасці выпадкаў гэты працэс звязаны з праблемай тэхнічнага забеспячэння творчасці (кіно, кніжныя выданні, тэатр, музыка), які патрабуе

Рэпазіторый БГУКІ

ўдзелу спецыялістаў і матэрыяльных сродкаў. І тут неабходнасць пасрэднікаў бясспрэчная.

Чым жа павінен кіравацца прадзюсер у сваёй дзейнасці: рынкам, атрыманнем прыбытку, інтарэсамі масавага спажыўца або эліты, развіццём мастацтва ці патрэбамі большасці людзей?

Адметнымі рысамі свядомасці мас з'яўляюцца наяўнасць стэрэатыпаў, амбівалентнасць ва ўспрыманні ідэй, сумяшчэнне процілеглых мэт і сэнсаў. Здольнасць мас засвойваць лепш неаднародную ідэю можна бачыць сёння ў нашай краіне ў адначасовым вылучэнні процілеглых патрабаванняў: свабоды і "дужай рукі", дабрабыту і роўнасці, эканамічнай эфектыўнасці і сацыяльнай справядлівасці. Такая асаблівасць свядомасці не можа выкарыстоўвацца дзеля абвінавачвання мас. Наадварот, аб'ектыўная разнастайнасць ідэй у масе стварае неабходныя для грамадскага развіцця альтэрнатывы.

Масавы характар грамадства і панаванне масы ў духоўнай вытворчасці фарміруюць грамадскую свядомасць, якая складае ідэальны вобраз грамадства. Гэты настрой пераносіцца ў мастацтва і навуку, што паказвае на панаванне мас у іх дзейнасці. Не ведаем, ці перарываецца сувязь паміж масамі, дзяржавай і інтэлігенцыяй, дзеля таго каб вызначыць мяжу, за якой патрабаванні мас ператвараюцца ў неадэкватнае разуменне сваіх інтарэсаў.

Няправільны ранейшы шлях дыялогу з масай вучыць яе. Але немагчымае і сляпое падпарадкаванне свядомасці мас.

Праз мастацтва людзі асвойваюць меру рэальнага, іншымі словамі, сваё стаўленне да жыцця. Сфарміраваныя такім чынам адносіны іншыя за адносіны, якія фарміруе да сябе само жыццё. Ідэальная мера рэальнага ў мастацтве ўтварае імкненне да ўвасаблення ідэалу ў рэчаіснасць.

Такім чынам, мастацтва выконвае вельмі значную ролю ў развіцці грамадства, і тут элітарная культура бясспрэчна неабходная.

Адным з найбольш устойлівых перакананняў маральнага ідэалізму была ўпэўненасць у тым, што



Рэпазіторый БДУКМ

эканамічныя матывы адносяцца да самых прымітыўных. Лічылася, што гэтыя матывы не могуць фарміраваць асобу, што свядомасць існуе недзе вышэй. У 20—30-я гады гэты погляд быў перанесены ў сацыялогію і пераўтварыўся ў канцэпцыю "эканамічнага чалавека", які арыентуецца ў свеце утылітарна і нават не мае ўяўлення аб маральным выбары. Мы называлі "эканамічнага чалавека" бездухоўным, а ён заняў значнае месца на лесвіцы духоўнага спажывання, і яго магчымасці, доступ да кніг, выстаў, канцэртаў узгадавалі яго калі не духоўна, дык культурна. Яны ж, гэтыя магчымасці, ствараюць сацыяльны заказ, на які амаль поўнасцю працуюць эстрада, мода, дызайн. Эканамічны чалавек, які заняў заўважальныя эканамічныя пазіцыі, адлюстраваў першаснасць эканомікі і ў галіне культуры.

Культура XX ст. не можа не быць культурай мас. Яна далучае іх да некалі недасяжнага працэсу асваення і ўтварэння грамадскіх і культурных формаў. Але, нягледзячы на гэта, культура не павінна страціць вышыні густу, унутраных нормаў. Не аддаючы перавагі элітарнаму ці масаваму ўспрыманню культуры, трэба звярнуць увагу на існаванне адной такой супярэчлівасці, як магчымасць яе вырашэння шляхам не выбару пазіцыі, а паступовага ўзаемадзеяння масавых густаў і густаў стваральнікаў культурных каштоўнасцей. Уключэнне мас у сацыяльны і культурны працэс ажыццяўляе ідэалы сацыяльнай справядлівасці, павышае адказнасць дзеячаў культуры за вынікі гэтага працэсу.

З'яўленне масавай аўдыторыі, якую дае цяпер наша грамадства, змяняе многія традыцыйныя формы сувязі з народам як спажыўцом культуры, а таксама эстэтычныя каноны, утварае новыя віды, жанры мастацтва, нават такія, у якіх страчаны непасрэдны эстэтычны змест. Яно можа выкарыстоўвацца толькі як прапаганда адметнага ладу пачуццяў, думак ці стылю жыцця, нясе ідэалагічны змест. Страта мастацкасці ў выніку негатыўна ўспрымаецца публікай. Масавая чытацкая, глядацкая, слухацкая

аўдыторыя не дазваляе ў наш час гаварыць аб творы без уліку яго грамадскага ўспрымання, але і не дазваляе зводзіць гэтую адзнаку выключна да яго. Навучыцца дыялогу з масай, уменню слухаць яе сапраўдны голас — вось важнейшая мэта дзеячаў духоўнай вытворчасці (Федотова В.Г. Практическое и духовное освоение действительности. — М., 1991.).

**Фядотаў А.Г.**,
саіскальнік кафедры
рэжысуры свят

## ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ Ў СУЧАСНАЙ СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАГА ГОРАДА

Святочная культура сучаснага беларускага горада перажывае перыяд грунтоўнай якаснай трансфармацыі, якую выклікалі сацыяльна-эканамічныя і палітычныя змены ў грамадскім жыцці рэспублікі. Гэта пераканаўча дэманструе пералік свят, зацверджаных указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Аб дзяржаўных святах і святочных днях у Рэспубліцы Беларусь" ад 26 сакавіка 1998 года.

У сённяшняй святочнай палітры рэспублікі згодна азначанага пераліку святы рэлігійных канфесій суіснуюць побач з днём ушанавання рэвалюцыйных падзей, якія паклалі пачатак дзяржаве, што аддзяліла сябе ад царквы, а святкаванні, што сцвярджаюць агульначалавечыя каштоўнасці, суседнічаюць з урачыстасцямі, прысвечанымі дэкларацыі перавагі адной сацыяльнай сістэмы над іншай. Азначаныя супрацьлегласці існуюць не толькі паміж асобнымі святамі, але нават у межах канкрэтнага святкавання, якое, змяніўшы сваю назву і знешнія рысы, працягвае захоўваць старыя формы правядзення.

Як сведчыць гістарычны вопыт, для пераходных перыядаў (змены культурна-гістарычных фармацый, мастацкіх стыляў і накірункаў) уласцівае суіснаванне адыходзячых культурных з'яў з новымі, што нараджаюцца